ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 36 (765) ● Пятніца, 12 снежня 1969 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII

## «ВЕРНЫЯ ЗАПАВЕТАМ ЛЕНІНА»

Пад такім дэвізам у чытальнай зале галоўнага корпуса адбылася маладзёжная канферэнцыя, арганізаваная аддзелам абслугоўвання бібліятэкі сумесна з кафедрай гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў.

— З усёй вялікай спадчыны Уладзіміра Ільіча, — сказала ва ўступным слове кандыдат гістарычных навук Г. А. Калініна,—для абмеркавання мы ўзялі работы «Вялікі пачын», «Як арганізаваць спаборніцтва», «Задачы Саюза моладзі» і вырашылі высветліць, як гэтыя работы дапамагаюць нашай моладзі ў будаўніцтве камуністычнага грамадства.

Выступіўшыя з дакладамі студэнты М. Сыркін, М. Радзько, У. Нікалаеў, В. Шталь, О. Ляшко расказалі прысутным аб гістарычных перадумовах узнікнення камуністычнага суботніка, стаханаўскім руху і сённяшніх ударніках камуністычнай працы, аб той ролі, якую адводзіў Уладзімір Ільіч моладзі ў павышэнні прадукцыйнасці працы, аб вернасці камсамольцаў ленінскім запаветам.

А. НАВІНСКІ.

# ЗАЛІК УСЯГО ЖЫЦЦЯ

Для камсамола і ўсёй моладзі падрыхтоўка да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна прыняла форму Ленінскага заліку. Нарадзіўшыся ў рабочым асяроддзі, залік атрымаў распаўсюджанне ва ўсіх арганізацыях і стаў сапраўдным праяўленнем высокай адказнасці кожнага члена ВЛКСМ за справы свайго калектыву, эфектыўнай формай справаздачы камсамольцаў аб тым, як выконваюцца запаветы У. І. Леніна моладзі.

Цяпер у нас ідзе III этап Ленінскага заліку. Вынікі папярэдняга былі падведзены на злёце ўдзельнікаў працоўнага семестра ў кастрычніку гэтага года. Яны радасныя для нашай арганізацыі.

Яшчэ ў красавіку камітэт камсамола пачаў работу па падрыхтоўцы і правядзенню Ленінскага заліку ў камсамольскіх групах.

Асобая ўвага была ўдзелена арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. З уздымам прайшлі камсамольскія сходы ў групах фізічнага, матэматычнага, гістарычнага факультэтаў, факультэта журналістыкі. Камсамольцы ўзялі канкрэтныя, рэальныя і суразмерныя магчымасцям абавязацельствы. Актыўна ўключыліся ў навуковую і лекцыйную работу, пачалі змагацца за лепшую паспяховасць.

Аднак ёсць яшчэ асобныя групы на хімічным, філалагічным, юрыдычным факультэтах, дзе да заліку адносяцца фармальна, не засвоіўшы той вялікай выхаваўчай ролі, якую адыгрывае Ленінскі залік у жыцці камсамольцаў групы. Галоўным недахопам з'яўляецца ўсё яшчэ нізкая камсамольская і вучэбная дысцыпліна, актыўнасць асобных груп, а нярэдка і курсаў.

Цяпер перад намі стаіць новая адказная і важная задача — арганізавана правесці заключны этап Ленінскага заліку — справаздачу аб зробленым па выкананню прынятых абавязацельстваў. Канкрэтным вынікам заліку павінна з'явіцца павышэнне паспяховасці і, у першую чаргу, па грамадскіх дысцыплінах.

Рашаючым момантам у ходзе Ленінскага заліку стала XXIII справаздачна-выбарная камсамольская канферэнцыя, на якой была прынята пастанова, што абавязвае ўсіх камсамольцаў універсітэта здаць курсавыя і дзяржаўныя экзамены па грамадскіх дысцыплінах на добра і выдатна. Гэта рэальна для нашай арганізацыі, і аб гэтым павінны памятаць усе камсамольцы, тым больш, што вывучэнне грамадскіх дысцыплін — адзін з пунктаў выканання Ленінскага заліку ў цэлым. Таму цяпер асабліва важным з'яўляецца кантроль за ходам выканання заліку. Яго здзяйсняюць спецыяльна створаныя камісіі, у састаў якіх уваходзяць члены партыйнага бюро факультэтаў, дэканы, выкладчыкі грамадскіх дысцыплін.

Камісіі каардынуюць усю работу, распаўсюджваюць вопыт лепшых груп, пастаянна інфарміруюць аб ходзе выканання сацыялістычных абавязацельстваў камітэты камсамола факультэтаў.

Адной з важных форм заліку, паказчыкам таго, наколькі глыбока мы валодаем багатай тэарэтычнай спадчынай Леніна, з'явіцца ўсесаюзны конкурс на лепшую студэнцкую работу. Актыўна ўключыліся ў падрыхтоўку да яго студэнты фізічнага, гістарычнага, філалагічнага факультэтаў і факультэта журналістыкі. Горшыя справы на матэматычным і біялагічным.

Адзначаючы прыкметную актывізацыю работы ўсёй камсамольскай арганізацыі ў выніку правядзення Ленінскага заліку, неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на недахопы. Па-першае, на некаторых факультэтах (філалагічным, хімічным, геаграфічным, юрыдычным) камітэты камсамола не вядуць па-сапраўднаму кантроль за ходам Ленінскага заліку. Ёсць групы, дзе яшчэ да гэтай пары не ведаюць, як праводзіць Ленінскі залік. Па-другое, нават на лепшых факультэтах (фізічны, гістарычны, матэматычны) ёсць групы, дзе далей размоў аб Ленінскім заліку справы не пайшлі. Прычына такога становішча заключаецца ў тым, што і камітэт камсамола універсітэта, і камітэты камсамола факультэтаў, бюро курсаў не заўсёды даходзяць да кожнай групы, кожнага камсамольца.

Па-трэцяе, недастаткова канкрэтна прадумана сістэма кантролю. Не на ўсіх факультэтах вядзецца ўлік сацыялістычных абавязацельстваў камсамольцаў і груп.

Па-чацвёртае, на геаграфічным, хімічным і філалагічным факультэтах ёсць факты фармальных адносін да правядзення Ленінскага заліку, калі камсамольскія групы бяруць добрыя абавязацельствы, але па-сур'ёзнаму не арганізуюць сваю работу.

Асабліва гэта адносіцца да сацыялістычных абавязацельстваў па вучобе. Не наладжана дапамога адстаючым, не ўвайшло ў практыку работы камсоргаў груп падвядзенне вынікаў кожных семінарскіх заняткаў сумесна з выкладчыкамі.

Для паспяховага выканання Ленінскага заліку ў кожнай групе неабходна стварыць атмасферу высокага палітычнага накалу, актывізаваць работу насценнага друку, рэгулярна, на кожным пасяджэнні камітэта камсамола заслухоўваць справаздачы груп, аналізаваць вынікі заліку. Неабходна часцей звяртацца за дапамогай у партыйныя арганізацыі, часцей ставіць гэтыя пытанні на абмеркаванне партыйных сходаў.

Вывучэнне твораў У. І. Леніна — адна з важнейшых састаўных частак Ленінскага заліку. І натуральна, што камсамольскія сходы ў групах неабходна правесці па ленінскай тэматыцы, цесна звязаўшы яе з жыццём групы на прыкладах выканання асабістых і групавых сацабавязацельстваў. Камітэт камсамола сумесна з кафедрамі грамадскіх навук рэкамендуе правесці камсамольскія сходы з павесткай дня: У. І. Ленін аб задачах Саюза моладзі; У. І. Ленін аб камуністычным выхаванні моладзі; У. І. Ленін аб значэнні навукі; роля студэнцтва ў навукова-тэхнічным прагрэсе краіны.

Завяршаючы этап Ленінскага заліку (сакавік—красавік 1970 г.) — падвядзенне вынікаў. Па форме — гэта грамадская атэстацыя кожнага камсамольца.

Падвядзенне вынікаў пройдзе ў рамках Усесаюзнага камсамольскага сходу пад лозунгам «Паленінску працаваць, вучыцца і жыць». У памяць аб удзеле ў Ленінскім заліку ў юбілейным годзе застанецца укладыш у камсамольскі білет з пametкай «Ленінскі залік здадзен».

Многія з нас здавалі нямала залікаў, але мы павінны памятаць, што Ленінскі — гэта залік усяго нашага жыцця.

У. НАУМЧЫК,
намеснік сакратара камітэта камсамола.

## СТУДЭНЦКІ НАВУКОВЫ

Па жаданню студэнтаў аддзялення палітэканоміі юрыдычнага факультэта створан навуковы гурток. Мэта яго своеасаблівая — глыбокае вывучэнне тэарэтычных прац папярэднікаў К. Маркса: Уільяма Пеці, Адама Сміта, Франсуа Кенэ, а таксама навуковых прац У. І. Леніна па аграрнаму пытанню. У гурток запісалася амаль палова студэнтаў III курса.

Нядаўна адбылося чарговае пасяджэнне навуковага гуртка. Са змястоўным дакладам аб творчай спадчыне Уільяма Пеці, яго укладзе ў эканамічную навуку выступіў студэнт Шмыгаў. Усе члены гуртка выступілі са сваімі разважаннямі і крытычнымі заўвагамі. Асабліва спадабаліся студэнтам працы папярэдніка К. Маркса «Трактат аб падатках і подацях» і «Рознае аб грошах». Дарэчы, працу «Рознае аб грошах» Маркс ацаніў як геніяльны твор. Творчая дыскусія аб Уільяме Пеці, на думку студэнтаў, дае магчымасць глыбей пранікнуць у тэарэтычную спадчыну Маркса, Энгельса, Леніна, глыбей зразумець марксізм як вучэнне аб класавай барацьбе ва ўмовах капіталізму і імперыялізму.

Цяпер студэнты ўзяліся за вывучэнне творчасці Адама Сміта.

Апрача вывучэння папярэднікаў Маркса, члены гуртка ўзяліся за распрацоўку некаторых сучасных эканамічных праблем. Ідучы насустрач 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, студэнт Л. Давыдзенка працуе над праблемай «У. І. Ленін аб навукова-тэхнічным прагрэсе і яго ўплыве на развіццё грамадска-вытворчых сіл», Студэнт Мархонька даследуе праблему «У. І. Ленін аб навуковых прынцыпах цэнаўтварэння», студэнт Вараб'ёў займаецца вывучэннем вытворчасці рабочай сілы ў сельскай гаспадарцы.

Кіруе гуртком даследчыкаў дацэнт У. А. Кулажанка.

А. БЛАКІТНЫ.

# ПЛЁН ПРАЦЫ МАЛАДЫХ

У апошні час у навуковым жыцці універсітэта і ўсёй рэспублікі адбыліся важныя падзеі — прайшлі навуковыя канферэнцыі маладых вучоных па прыродазнаўчых і грамадскіх навуках, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. На пленарных і секцыйных пасяджэннях заслухана больш 340 дакладаў, у якіх маладыя даследчыкі прадставілі вынікі сваёй творчай працы.

Як паведаміў старшыня арганізацыйнага камітэта канферэнцыі маладых вучоных па прыродазнаўчых навуках прафесар Ю. С. Багданаў, канферэнцыя паказала, што ў БССР вядуцца інтэнсіўныя даследаванні па многіх актуальных праблемах сучасных прыродазнаўчых навук. Даклады, якія былі заслуханы і абмеркаваны, уяўляюць навуковы і практычны інтарэс.

На першым пленарным пасяджэнні канферэнцыі маладых вучоных па грамадскіх навуках былі заслуханы даклады выкладчыка кафедры філасофіі БДУ Л. С. Трэпавай «У. І. Ленін і партыйнасць гістарычнай навукі», кандыдата філасофскіх навук в. а. дацэнта кафедры палітэканоміі і філасофіі Магілёўскага педагагічнага інстытута П. Е. Фурса «У. І. Ленін аб асноўных прынцыпах маральнага выхавання» і аспіранта кафедры навуковага камунізма БДУ В. В. Каклюхіна «Асаблівасці выхавання моладзі ў сучасны перыяд».

Прафесар В. І. Сцяпанаў, які ўзначальваў арганізацыйны камітэт, адзначыў, што даклады Л. С. Трэпавай і П. Е. Фурса выклікалі вялікую цікавасць ва ўдзельнікаў канферэнцыі, бо з'явіліся вынікам сур'ёзнай навуковай працы. Даклад жа В. В. Каклохіна быў аднабаковым. Аўтар захапіўся выкладаннем фактаў амаралізму ў капіталістычным свеце, а асноўныя пытанні тэмы выклаў бегла і павярхоўна. На пасяджэннях секцый, якія прайшлі пры вялікай актыўнасці іх удзельнікаў, былі зроблены асобныя крытычныя заўвагі па шэрагу іншых дакладаў, выказаны карысныя прапановы. Аўтарам дакладаў было зададзена вельмі многа пытанняў.

Прайшоўшыя канферэнцыі з'явіліся своеасаблівым аглядам творчых сіл маладога пакалення вучоных, выявілі вялікі плён іх працы ў самых розных галінах навукі. Аб вялікай цікавасці да работ маладых вучоных гаворыць і тое, што ўсе даклады рэкамендаваны да друку.

А. АЛЕНІЧ.



*Нядаўна ва універсітэце прайшла інтэрнацыянальная студэнцкая навукова-тэарэтычная канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.*
*На здымку: удзельнікі канферэнцыі.*

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

## ГАРЫЗОНТЫ ПРАФСАЮЗНАГА ЖЫЦЦЯ

**ДАРАГІ ЧЫТАЧ!**

**Пад гэтай рубрыкай мы будзем друкаваць матэрыялы пра абавязкі і правы члена прафсаюза, расказваць аб метадах і формах прафсаюзнай дзейнасці. Перад табой выступяць нашы лепшыя праформі, падзеляцца вопытам члены прафбюро факультэтаў і прафкома. Ты зможаш прачытаць расказы, карэспандэнцыі пра сваіх таварышаў, даведаешся аб іх вучобе, адпачынку, грамадскай дзейнасці.**

**Спадзяемся, дарагі чытач, што матэрыялы, якія будуць змяшчацца пад рубрыкай «Гарызонты прафсаюзнага жыцця», зацікавяць цябе і ты выкажаш праз нашу газету свае меркаванні, парады, раскажаш аб поспехах і недахопах прафсаюзнай работы ў групе, на курсе, факультэце. Сёння мы прапануем першы матэрыял з гэтай серыі.**

# З ПРАВАМ РАЙКОМА

З таго часу, калі прафком атрымаў правы райкома, прайшло не больш двух месяцаў. На першы погляд, здаецца, новага нічога не адбылося: пытанні, якія павінен рашаць прафком, застаюцца па-ранейшаму тымі ж — паляпшаць вучэбны працэс, умовы жыцця і быту студэнтаў. Аднак справа тут зусім іншая. Формы і метады рашэння гэтых задач значна змяніліся. Ужо зараз практыка паказвае, што ўвогуле ўсе функцыі райкома нельга перанесці механічна на пярвічныя арганізацыі: тут яшчэ застаецца цэлы шэраг пытанняў са сваімі асаблівасцямі. З другога боку — прафком атрымаў паўнамоцтвы, якіх да гэтага не было. Прама скажам, што з новай пастановай аб правах райкома перад намі ўзніклі і новыя праблемы арганізацыйнага парадку. Зараз з ліку членаў прафкома выбран прэзідыум. Гэта дае магчымасць больш апаратыўна вырашаць пытанні студэнцкага жыцця. Значна пашырыліся правы нашых факультэцкіх арганізацый. У новых умовах працы яны атрымалі большую самастойнасць. За прыкладам далёка хадзіць не трэба. Возьмем такія пытанні, як выдача пуцёвак у студэнцкі прафілакторый, праязных білетаў, аказанне матэрыяльнай дапамогі. Раней усім гэтым займаўся толькі прафком. Але калі універсітэт налічвае больш васьмі з палавінай тысяч студэнтаў, цяжка выявіць умовы жыцця кожнага члена прафсаюза. Практычна зрабіць гэта было амаль немагчыма. Ды і не ўсе студэнты былі ахоплены прафсаюзнымі даручэннямі.

Прафсаюзныя арганізацыі факультэтаў бліжэй стаяць да студэнта, лепш могуць ведаць спецыфіку курсаў і груп у вучэбным працэсе, асаблівасці той ці іншай групы. Адсюль і вынік — актывісты факультэтаў больш рэальна і правільна могуць вырашаць такія пытанні, як выдзяленне пуцёвак і аказанне матэрыяльнай дапамогі.

Мне могуць запярэчыць, што з новымі правамі работа прафкома, маўляў, у асноўным ускладзецца на факультэцкія арганізацыі. Вядома, так думаць—значыць не ведаць сутнасці справы.

Ужо гэтыя два месяцы пасля агульнауніверсітэцкай канферэнцыі паказалі, што стварэнне прэзідыума паскорыла справы ў апаратыўным і, галоўнае, калегіяльным рашэнні задач.

Больш таго, шырэй сталі правы і абавязкі створаных пры прафкоме камісій. Словам, ім ва «ўнутраных» справах поўная дэмакратыя. Яны самастойна разглядаюць пытанні быту студэнтаў у інтэрнатах, паляпшэнне вучэбнага працэсу на факультэтах, выяўляюць студэнтаў, якім неабходна лячэнне.

Ясна, што за такі кароткі час сваёй дзейнасці прэзідыум не паспеў рашыць усе задачы нашага студэнцкага жыцця. Ды і рашыць іх адразу немагчыма. Усё робіцца паступова і напружанай працай, а гэта залежыць ад таго, як члены прафкома адносяцца да сваіх абавязкаў, як ацэньваюць тое давер'е, якое аказалі ім прафсаюзныя арганізацыі факультэтаў...

У нас ёсць шмат прафсаюзных работнікаў з вопытам. Ім даручаны больш важныя галіны нашай працы. Так, другі год запар абран членам прафкома Анатоль Злотнікаў, які з'яўляецца старшынёй жыллёва-бытавой камісіі прафкома.

Атрыманне прафкомам райкомаўскіх праў паставіла перад прэзідыумам новыя задачы па вучобе прафсаюзных актывістаў. Як вучыць актывіста прафсаюзнай рабоце, якія формы і метады лепш выбраць — не раз гэтыя пытанні абмяркоўваліся сярод членаў прэзідыума. Адны лічылі, што неабходна праводзіць агульнауніверсітэцкія нарады прафоргаў, другія даказалі, што гэтую работу трэба перанесці непасрэдна на факультэты. Старшыня прэзідыума прафкома Л. Сабалеўскі прапанаваў арганізаваць школу прафсаюзнага актыву. На чарговым пасяджэнні прэзідыума прафкома зацвердзілі актыў савета, распрацавалі план работы школы. Ужо цяпер праводзім семінары па арганізацыйных пытаннях з старшынямі прафбюро факультэтаў, з членамі створаных камісій пры прафкоме і факультэтах, са старшынямі студсаветаў інтэрнатаў. На факультэтах праводзяцца семінары з прафсаюзнымі арганізатарамі. План савета школы прафсаюзнага актыву разлічан толькі на першы семестр навучальнага года; і калі мы зараз у асноўным плануем вучобу, то ў наступным годзе будзем звяртаць большую увагу на абмен вопытам сярод прафоргаў груп, старшынь прафбюро факультэтаў і членаў камісій. Закончыцца вучоба ў гэтым годзе спецыяльным вечарам прафсаюзнага актывіста. Тут мы зможам заслухаць невялікі даклад члена ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў М. П. Баранавай, падвесці вынікі працы, узнагародзіць прафсаюзных актывістаў.

Вядома, што савет школы прафактыву, хоць ён і аўтарытэтны, не можа спаўна вырашаць усе пытанні вучобы ў такім шматлікім калектыве, як наш. Таму неабходна выкарыстаць і іншыя метады і формы, якія ёсць у прафсаюзнай практыцы. Прывяду прыклад. Часам даводзіцца чуць аб дзяжурстве членаў прафбюро ў прафсаюзных пакоях не вельмі прыемныя словы: «Адсядзеў сваё, ды й годзе». Мне здаецца, што, так мяркуючы, актывісты не разумеюць поўнасцю абавязкаў, ускладзеных на дзяжурных. Па-першае, дзяжурны павінен абавязкова выконваць некаторыя абавязкі: прымаць заявы ад студэнтаў, даваць тлумачальныя адказы на пытанні, займацца арганізацыйнай справай. Адначасова ён абавязан знаёміцца з работай прафбюро ці прафкома, па-дзелавому ўнікаць у спецыфіку прафсаюзнай работы, вывучаць яе формы і метады. На жаль, такую форму вучобы прафсаюзнага актыву выкарыстоўваюць не ва ўсіх факультэцкіх арганізацыях.

Жыццё прафсаюзнай арганізацыі патрабуе ад актывістаў асобага стылю ў рабоце. Цяпер ужо становіцца правілам ацэньваць эфектыўнасць працы не колькасцю пасяджэнняў, нарад, пастаноў, а канкрэтнымі справамі ў вырашэнні надзённых задач, глыбінёй падыходу да справы.

Рыхтуючыся дастойна сустрэць 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна, прафсаюзным арганізацыям факультэтаў неабходна асаблівую ўвагу звярнуць на сацыялістычнае спаборніцтва за лепшую арганізацыю вучэбнага працэсу, за лепшую групу. Важна, каб прафсаюзныя актывісты былі запявaламі гэтага спаборніцтва і паказвалі прыклад для ўсіх студэнтаў у вучобе і грамадскай рабоце.

**М. ДРОЗД,**
намеснік старшыні прафкома.



У час практыкума студэнтаў IV курса біяфака кансультуе асістэнт І. І. Даўгалевіч.
Фота М. Нечыпарэнкі.

# РАІЦЦА АКТЫЎ

З прыходам зімы на ўсіх факультэтах больш выразна адчуваецца набліжэнне сесіі. Мнагалюдней стала ў чытальных залах універсітэцкай бібліятэкі і інтэрнатаў. Пабочныя справы адкладзены на потым. Усімі валодае адна думка: «Як лепш здаць сесію?».

У гэты напружаны час і сабраўся актыў фізічнага факультэта на чарговыя заняткі. На іх прысутнічаў намеснік дэкана М. С. Гарашчук.

Фізічны факультэт вельмі вялікі. Сачыць за паспяховасцю кожнага складана, але дэканат робіць захады, каб наблізіцца да студэнцкай масы, выхаваць у кожным адказнасць не толькі за сябе, а і за сваіх аднакурснікаў. І не выпадкова М. С. Гарашчук асноўную ўвагу звярнуў на тое, як падняць актыўнасць радавых камсамольцаў. Пытанне хвалюючае, і Міхаіл Сцяпанавіч гаварыў узрушана:

— Што ад вас патрабуецца? Добрасумленныя адносіны да заняткаў. Але нават у гэтым юбілейным годзе 80 студэнтаў нашага факультэта маюць запазычанасці. Вядома, дэканат будзе выхоўваць іх сваімі метадамі, у тым ліку і пакараннем, але што вы зрабілі ў адносінах да гэтых студэнтаў? Нічога. Работа непасрэдна з імі не вядзецца. Дык давайце падумаем разам, што рабіць?

М. С. Гарашчук падрабязна разабраў усе магчымасці паляпшэння вучобы студэнтаў. Было адзначана, што асновай непаспяховасці многіх з'яўляецца нерэгулярнае наведванне лекцый. Як паказалі апошнія праверкі, асабліва часта прапускаюць заняткі старшакурснікі. І зноў Міхаіл Сцяпанавіч звяртаецца да прысутных:

— Чаму вы абыякавыя да таго, што ваш аднакурснік не ідзе на заняткі? Актыў груп павінен абмяркоўваць кожны пропуск на сваіх сходах. А калі пропускі будуць паўтарацца, неабходна паведаміць аб гэтым у дэканат.

М. С. Гарашчук не забыўся і на першакурснікаў, якія адчуваюць разгубленасць перад першай сваёй вельмі адказнай сесіяй.

Чацвёртакурснікі вырашылі ўзяць шэфства над малодшымі сябрамі. Абяцалі праводзіць з імі кансультацыі, падзяліцца вопытам падрыхтоўкі да экзаменаў. Была падтрымана думка Мікалая Дабрусёва аб арганізацыі кансультацыйных пунктаў для ўсіх студэнтаў, якія адчуваюць няўпэўненасць у сваіх ведах.

Паколькі аўдыторыя сабралася вялікая, Міхаіл Сцяпанавіч дамовіўся з прадстаўнікамі патокаў сустрэцца асобна і пагаварыць больш падрабязна аб наведванні заняткаў і падрыхтоўцы да іх, аб паводзінах студэнтаў, рабоце ў групах.

**Н. САЛУК,**
**студэнтка.**

# НА ПЕРШЫМ ПЛАНЕ—СЕСІЯ

На юрыдычным факультэце, як і на іншых, на першым плане цяпер падрыхтоўка да залікаў, экзаменаў. І мы вырашылі пагутарыць перш за ўсё з тымі, чые партрэты ўбачылі на Дошцы гонару.

Вось Каця Мітраховіч, студэнтка II курса, камсорг групы.

— У гэты час галоўнае — падрыхтоўка да зімовай сесіі,—расказвае яна.—Асабліва многа ўвагі ўдзяляем першакурснікам, дапамагаем ім парадамі, перадаем свой вопыт. Многае робіцца і на нашым курсе. Разгарнулася спаборніцтва паміж вучэбнымі групамі, ва ўмовах якога такія пункты, як паспяховасць (сярэдні бал групы), колькасць прапушчаных гадзін і грамадская, камсамольская работа.

Член акадэмічнай камісіі Света Гайкова добра ведае справы свайго факультэта і шмат чаго можа расказаць.

— Пятая група нашага III курса, напрыклад, займаецца толькі добра і выдатна,— паведаміла Света. — Яна спаборнічае з I групай. Пасля таго, як падвялі вынікі, аказалася, што V група першая па паспяховасці не толькі на курсе, але і на факультэце. Добры прыклад паказвае камсорг групы В. Марчанка.

Пабывалі мы і ў камітэце камсамола. Пагутарылі з намеснікам сакратара камсамольскай арганізацыі юрфака па арганізацыйнай рабоце Іванам Клімавым. Ён расказаў аб шматлікіх мерапрыемствах па падрыхтоўцы да сесіі, якія праводзяцца на факультэце. Так, прайшлі сходы груп, на якіх былі прыняты сацыялістычныя абавязацельствы. Шмат часу ўдзяляе камітэт камсамола рабоце з першакурснікамі. Члены камітэта часта наведваюць іх, расказваюць аб сесіі, аб метадах падрыхтоўкі да яе, расказвае Ваня. Асабліва цяжка першакурснікам даецца логіка, і гэтаму прадмету трэба ўдзяляць больш увагі.

Нядрэнна працуюць камсоргі. Трэба адзначыць сакратара камсамольскай арганізацыі I курса Рычарда Янчэліка. Добры хлопец. Сам займаецца выдатна і другім заўсёды дапамагае.

Мяркуючы па падрыхтоўцы да сесіі, можна з упэўненасцю сказаць, што пройдзе яна паспяхова, заключыў Клімаў.

**М. МЯТЛА,**
**В. ФЕРАНЦ,**
**студэнты.**





*Наш фотакарэспандэнт пабываў у першакурснікаў геолага-геаграфічнага факультэта і зазняў іх у час заняткаў па аналітычнай хіміі, якімі кіраваў выкладчык І. Б. Станкевіч.*

# ВАЕННА-ТЭХНІЧНЫЯ ВЕДЫ—КОЖНАМУ

У пастанове ЦК КПСС «Аб 50-годдзі ВЛКСМ і задачах камуністычнага выхавання моладзі» падкрэслена, што камсамол прызван актыўна ўдзельнічаць у ажыццяўленні ваеннага навучання, падрыхтоўцы выпускнікоў, прыцягваць юнакоў і дзяўчат да работы ў ДТСААФ, садзейнічаць выкананню закона аб усеагульнай воінскай павіннасці. Камсамол павінен быць вядучай сілай развіцця фізічнай культуры і спорту, а камсамольцы і моладзь—актыўнымі ўдзельнікамі масавага фізкультурнага руху.

Зрабіць кожнага маладога чалавека гатовым у любую мінуту стаць на абарону Радзімы—адна з галоўных задач усесаюзнага агляду спартыўнай і абаронна-масавай работы і экзамена па ваеннай і фізічнай падрыхтоўцы, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Агляд абаронна-масавай работы праводзіцца ў тры этапы на працягу 1969—1970 гг.

І ЭТАП—ЧЭРВЕНЬ 1969 ГОДА—КРАСАВІК 1970 ГОДА—прадугледжвае выкананне наступных патрабаванняў, неабходных для правядзення экзамена па ваенна-тэхнічнай падрыхтоўцы:

— правядзенне шырокай растлумачальнай работы сярод камсамольцаў і моладзі аб мэтах і задачах усесаюзнага агляду спартыўнай і абаронна-масавай работы і экзамена па фізічнай і ваенна-тэхнічнай падрыхтоўцы, прыцягненне кожнага члена ВЛКСМ, юнакоў і дзяўчат у ДСТ, ДТСААФ;

— набыццё і падрыхтоўка неабходнага інвентару, стварэнне, добраўпарадкаванне прасцейшых спартыўных пляцовак і збудаванняў (у тым ліку па месцы жыхарства, у аздараўленчых лагерах і зонах адпачынку), вучэбных класаў, ваенных кабінетаў і іншых аб'ектаў фізічнай і ваенна-тэхнічнай падрыхтоўкі;

— падрыхтоўка трэнераў-актывістаў, суддзяў па спорту, інструктараў па турызму, кіраўнікоў спартыўных і ваенна-тэхнічных гурткоў, клубаў і аб'яднанняў, арганізатараў ваенізаваных падарожжаў;

— максімальнае прыцягненне камсамольцаў і моладзі да рэгулярных заняткаў у спартыўных і турысцкіх секцыях, ваенна-тэхнічных гуртках, на курсах грамадзянскай абароны;

— масавы ўдзел юнакоў і дзяўчат у традыцыйных зімовых і летніх спаборніцтвах, кросах, IX усесаюзнай летняй спартакіядзе прафсаюзаў, ва ўсесаюзнай спартакіядзе па ваенна-тэхнічных відах спорту, комплексных мерапрыемствах, забяспячэнне пры гэтым высокай культуры і эстэтыкі у правядзенні спаборніцтваў.

ІІ ЭТАП—МАЙ—ЧЭРВЕНЬ 1970 ГОДА—прадугледжвае правядзенне экзамена для юнакоў і дзяўчат па фізічнай і ваенна-тэхнічнай падрыхтоўцы па наступных нарматывах:

бег 100 м,

плаванне 100 м або 300 м,

прыжкі ў даўжыню і ў вышыню,

кіданне гранаты на адлегласць і ў цэль,

удзел у лёгкаатлетычным кросе,

падцягванне на перакладзіне, лазанне па шасту або канату (па выбару),

выжыманне гіры, штурханне ядра (па выбару),

удзел у турысцкім паходзе (пешы, на веласіпедах, лодках) з праверкай турысцкіх навыкаў, спосабаў арыентавання на мясцовасці або ваенная гульня (па выбару),

стральба з малакаліберный вінтоўкі або баявой стралковай зброі па цэлі,

авалоданне адной з ваенна-тэхнічных спецыяльнасцей (ваджэнне аўтамашыны, матацыкла, катэра, матаролера, трактара, маторнай лодкі, скутэра, упраўленне планёрам, прыжкі з парашутам, уменне працаваць на прыёмна-перадатачнай апаратуры (па выбару),

аказанне першай медыцынскай дапамогі пацярпеўшым.

ЗАЎВАГІ:

1. Да здачы практычных нарматываў дапускаюцца юнакі і дзяўчаты ад 14 да 28 год, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі агляду і не маюць супрацьпаказанняў у стане здароўя.

2. З 11 нарматываў абавязковым з'яўляецца выкананне: для юнакоў—7, дзяўчат—5. У залік могуць ісці экзамены па лыжнаму спорту, прынятыя зімой. Авалоданне адной з ваенна-тэхнічных спецыяльнасцей з'яўляецца абавязковым.

3. Здаўшымі экзамен лічацца ўдзельнікі, якія выканалі устаноўленыя нарматывы на ўзроўні не ніжэй патрабаванняў спартыўнага комплексу ГТО—для ўдзельнікаў да 16 год і новага спартыўна-тэхнічнага комплексу ГЗР—для ўдзельнікаў 16—18 год і больш, зацверджанага ў 1969 г. Для здаўшых залікі ўстанаўліваюцца адпаведна патрабаванням нарматываў комплексу ГТО.

4. Юнакам дапрызыўнага і прызыўнага ўзросту, прыняўшым удзел у экзамене па фізічнай і ваенна-тэхнічнай падрыхтоўцы, можа быць залічана здача нарматываў комплексу ГЗР па ўстаноўленых патрабаваннях.

ІІІ ЭТАП — ЛІПЕНЬ — КАСТРЫЧНІК 1970 ГОДА—падвядзенне вынікаў на факультэтах і правядзенне злёту.

ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ

Для падвядзення вынікаў агляду і правядзення экзамена ў пярвічных камсамольскіх арганізацыях ствараюцца камісіі, у састаў якіх уваходзяць ветэраны Узброеных Сіл Саюза ССР, прадстаўнікі падшэфных воінскіх часцей, прадстаўнікі камсамольскага, прафсаюзнага і спартыўнага актыву.

Пры падвядзенні вынікаў лепшымі будуць лічыцца тыя камсамольскія арганізацыі, якія разам з прафсаюзнымі, спартыўнымі і арганізацыямі ДТСААФ правядуць найбольш змястоўную і якасную работу ў ходзе агляду і забяспечаць стопрацэнтную здачу экзамена.

Вынікі агляду і экзамена на факультэтах будуць падведзены на вечарах і нарадах актыву універсітэта.

# ПАСТАНОВА

## бюро камітэта камсамола, прэзідыума прафкома, камітэта ДТСААФ і кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУ імя У. І. Леніна

### АБ УДЗЕЛЕ ПЯРВІЧНЫХ КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ УНІВЕРСІТЭТА ВА УСЕСАЮЗНЫМ АГЛЯДЗЕ СПАРТЫЎНАЙ І АБАРОННА-МАСАВАЙ РАБОТЫ І ПРАВЯДЗЕННІ ЭКЗАМЕНА ПА ФІЗІЧНАЙ І ВАЕННА-ТЭХНІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ

З мэтай паспяховага выканання пастановы сакратарыята ЦК ВЛКСМ, сакратарыята ВЦСПС, Камітэта па фізічнай культуры і спорту ЦК ДТСААФ бюро камітэта камсамола, прэзідыум прафкома універсітэта, прэзідыум камітэта ДТСААФ, кафедра фізвыхавання і спорту пастанаўляюць:

1. Абавязаць усе пярвічныя камсамольскія арганізацыі распрацаваць канкрэтны план мерапрыемстваў па агляду абаронна-масавай работы і правядзенню заліку па фізічнай і ваенна-тэхнічнай падрыхтоўцы.

2. Для кіраўніцтва правядзеннем агляду абаронна-масавай работы і заліку стварыць штаб у наступным саставе:

У. НАУМЧЫК—намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта, старшыня штаба М. ГАРЛАТАЎ—старшыня камітэта ДТСААФ універсітэта, намеснік старшыні штаба, М. ДРОЗД—намеснік старшыні прэзідыума прафкома універсітэта, намеснік старшыні штаба, Н. МАКАРЭВІЧ — старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту, намеснік старшыні штаба, В. ХРЭНАЎ — старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту, намеснік старшыні штаба, В. УСЦІНОВІЧ — старшы выкладчык кафедры грамадзянскай абароны, В. БАРОДКІН—старшы выкладчык ваеннай кафедры, А. ВАРАБ'ЕВА — загадчык сектара ваенна-патрыятычнага выхавання камітэта камсамола універсітэта, Г. ЧАПУРНОЙ —загадчык сектара спартыўнай работы камітэта камсамола універсітэта, Л. ЕКЕЛЬ — намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта журналістыкі, Е. БАРАНАЎ — намеснік сакратара камітэта камсамола фізічнага факультэта, С. АБДУЛАДЗЕ — намеснік сакратара камітэта камсамола хімічнага факультэта, І. ПРЫМАКОЎ — старшыня спартыўна-масавай камісіі прафкома універсітэта, В. ЦІТАРУК — студэнт V курса гістарычнага факультэта.

3. Абавязаць рэдкалегіі насценных газет і прэсгрупу пры камітэце камсамола універсітэта шырока асвятляць ход правядзення агляду і экзамена.

4. Камітэтам камсамола факультэтаў і камітэту ДТСААФ універсітэта распрацаваць план тэарэтычных і практычных заняткаў па стралковай падрыхтоўцы.

5. Установіць пераходныя вымпелы для лепшай камсамольскай групы і курса, камсамольскай арганізацыі факультэта.

6. Камітэтам камсамола факультэтаў распрацаваць падрабязны план правядзення агляду і заліку ў пярвічных камсамольскіх арганізацыях.

# *МЕРАПРЫЕМСТВЫ*

### камітэта камсамола універсітэта па правядзенню агляду абаронна-масавай работы і экзамена па фізічнай і ваенна-тэхнічнай падрыхтоўцы

*1. Правесці навукова-практычную канферэнцыю па ваенна-патрыятычнаму выхаванню і па правядзенню агляду і экзамена.*

*2. Зрабіць наглядную агітацыю на факультэтах і ў інтэрнатах:*

*а) 14 стэндаў па ваенна-патрыятычнай тэматыцы;*

*б) бібліятэкі ваеннай кнігі.*

*3. Стварыць гурткі па падрыхтоўцы шафёраў-аматараў, матацыклістаў, падрыхтаваць каманды па стралковаму спорту, парашутнаму спорту і падводнаму плаванню.*

*4. У ходзе агляду-конкурсу дабіцца прыцягнення ўсіх камсамольцаў у рады ДТСААФ.*

*5. Правесці семінар сакратароў камсамольскіх бюро курсаў па правядзенню агляду і экзамена.*

*6. Стварыць на базе Стаўбцоўскай СШ № 1 ваенна-спартыўны лагер для вучняў-дапрызыўнікаў.*

*7. Стварыць пры бібліятэцы універсітэта куток баявой і працоўнай славы супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта.*

*8. Пабудаваць ціры для падшэфных школ Стаўбцоўскага раёна.*

*9. Арганізаваць і правесці агітпаходы па памятных месцах.*

*10. Правесці Дзень памяці ахвяр фашызму 26 мая 1970 года.*

*11. У кастрычніку 1971 года адкрыць помнік загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны студэнтам, выкладчыкам і супрацоўнікам Беларусдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.*

*12. Правесці тыдзень сустрэч з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны «Агнём сэрца» ў маі 1970 года.*

*13. Арганізаваць на ваеннай кафедры кінафестываль фільмаў па ваенна-патрыятычнай тэматыцы.*

*14. Арганізаваць лекторый «Юнацтва выконвае ленінскі наказ аб абароне сацыялістычнай Айчыны».*

*15. Правесці фотаконкурс па ваенна-патрыятычнай тэматыцы.*

*16. Правесці рэйд па добраўпарадкаванню месц народнага подзвігу ў Стаўбцоўскім раёне.*

*17. Правесці фестываль песні Вялікай Айчыннай вайны ў маі 1970 года.*

# НАРМАТЫВЫ

### ЗДАЧЫ ЭКЗАМЕНА ПА ФІЗІЧНАЙ І ВАЕННА-ТЭХНІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ

## *МУЖЧЫНЫ*

Бег 100 м — 15,4 сек.

Плаванне 100 м — 2 мін. 50 сек., або 300 м без уліку.

Граната (700 гр) — 34 м.

Лыжы — 5 км — 29 мін., 10 км — 62 мін.

Лёгкаатлетычны крос — 800 м — 2 мін. 55 сек., 1000 м — 4 мін.

Ядро (7 кг) — 6 м 80 см.

Стральба (5 выстралаў) — 20 ачкоў.

Турысцкі паход — І катэгорыя.

Авалодаць ваенна-тэхнічнай спецыяльнасцю і прыёмамі медыцынскай дапамогі.

Прыжкі ў даўжыню — 4 м.

Прыжкі ў вышыню — 120 см.

Падцягванні — 6 разоў.

Выжыманне гіры (32 кг) — 6 разоў.

## *ЖАНЧЫНЫ*

Бег 100 м — 17 мін. 4 сек.

Плаванне — без уліку.

Лыжы — 3 км — 25 мін.

Лёгкаатлетычны крос — 500 м — 2 мін. 15 сек.

Ядро (4 кг) — 5 м.

Стральба — прыняць удзел.

Турысцкі паход — прыняць удзел.

Ваенна-тэхнічная спецыялізацыя — ведаць.

Авалодаць прыёмамі медыцынскай дапамогі.

Прыжкі ў даўжыню — 3 м.

Прыжкі ў вышыню — 95 см.

# ВІНШУЕМ З ПОСПЕХАМ!

**На гэтых днях у Маскве закрылася Міжнародная выстаўка мастацкай фатаграфіі, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. На ёй было прадстаўлена 2600 твораў майстроў з 60 краін свету. Прыняў удзел у гэтай выстаўцы і супрацоўнік нашага універсітэта, член Саюза журналістаў СССР Давід Рамакавіч Прэс. Ён прадставіў чатыры фотаработы, якія адлюстравалі яскравыя моманты са шматграннага жыцця беларускага народа. Сярод іх быў і поўны тонкага гумару і лірызму здымак, жартаўліва названы «А ты почему в шубке?».**

**І вось з Масквы прыйшла прыемная вестка: у ліку ўдастоеных прэміі— фотаработа Д. Р. Прэса «А ты почему в шубке?»**

**Мы горача віншуем нашага актыўнага карэспандэнта і памочніка Д. Р. Прэса з вялікім поспехам і жадаем яму многіх творчых удач.**

**Галоўны прыз выстаўкі прысуджан фотакарэспандэнту ТАСС В. Собалеву за здымак «Красная Площадь. К Ленину».**



# ПРЫСВЕЧАНА ПАЛОНСКАМУ

*Адбылося расшыранае пасяджэнне кафедры рускай класічнай літаратуры, прысвечанае юбілею Якава Палонскага. З уступным словам на ім выступіў прафесар Ф. І. Куляшоў. Ён расказаў аб творчай манеры паэта, грамадскім змесце яго лірыкі.*

*Студэнты выступілі з цікавымі дакладамі: «Жыццё і творчасць Я. Палонскага», «Тургенеў і Палонскі», «Мастацкія асаблівасці паэзіі Палонскага».*

# СПОРТ

## МУШКЕЦЁРЫ ВЫСВЕТЛІЛІ АДНОСІНЫ

Гэта былі самыя масавыя спаборніцтвы за ўсю гісторыю развіцця фехтавання ва універсітэце. За першынство змагаліся 78 мушкецёраў — прадстаўнікі васьмі факультэтаў.

У спаборніцтве на шпагах першае месца заняў майстар спорту студэнт III курса біяфака Аляксандр Нечапурэнка, на другім месцы кандыдат у майстры спорту студэнт II курса фізічнага факультэта Мікалай Собалеў, трэцяе месца замацаваў за сабой Аляксандр Каўтанюк (геафак, II курс). Пераможцам спаборніцтваў на шаблях стаў асістэнт кафедры электрафізікі Марк Ліўшыц, на другім месцы — выпускнік філфака Леанід Рабчыкаў, на трэцім — Юры Барысаў, студэнт IV курса біяфака. Сярод рапірыстаў прызёрамі аказаліся Дзмітрый Царук, кандыдат у майстры спорту (фізфак, II курс), Уладзімір Парткоў (хімфак, III курс), Аляксандр Каўтанюк.

Найбольш упартая барацьба за прызавыя месцы разгарэлася ў спаборніцтве рапірыстак. Першынство тут выявілася толькі ў выніку паўторнага бою паміж А. Васільевай (фізфак, вячэрняе аддзяленне, I курс) і Т. Васючковай (матфак, IV курс), які выйграла А. Васільева. Трэцяе месца аспрэчвалі Н. Макарская (філфак, IV курс) і З. Сыцько (юрфак, II курс). Выйграла з перавагай у адзін укол Н. Макарская.

Камандныя месцы размеркаваліся наступным чынам: I — фізфак (33 ачкі), II — біяфак (39), III — хімфак (56), IV — матфак (68), V — гістфак (106,5), VI — філфак (132). Геаграфічны і юрыдычны факультэты не выставілі неабходнай колькасці ўдзельнікаў.

**В. ХРЭНАЎ,**
галоўны суддзя спаборніцтваў.

## СЮРПРЫЗ ПЕРШАКУРСНІЦ

*На факультэце журналістыкі прайшло першынство па валейболу. Мацнейшымі аказаліся валейбалісты III курса. Але перамога дасталася ім у даволі ўпартай барацьбе. Калі ў першакурснікаў яны выйгралі параўнаўча лёгка, то ў матчы з камандай II курса балельшчыкам пераможцаў давялося пахвалявацца. Але моцныя ўдары нападаючых У. Цвяткова, Ф. Велікасельца не пакінулі надзеі на перамогу ў другакурснікаў.*

*Наступныя месцы занялі каманды II і I курсаў.*

*Па-за канкурэнцыяй сярод дзяўчат былі першакурсніцы. Яны лёгка абыгралі сваіх саперніц і сталі пераможцамі. Гэта прыемны сюрпрыз, бо факультэт наш невялікі і добрых валейбалістак пакуль мала.*

*Па выніках спаборніцтва ўкамплектаваны зборныя каманды факультэта па валейболу, якія рыхтуюцца да першынства універсітэта.*

*Н. ШЛОМА.*

## ПЕРАМАГЛІ МАТЭМАТЫКІ

Нядаўна паміж студэнтамі матэматычнага і хімічнага факультэтаў, якія жывуць у інтэрнаце № 16 па вуліцы Кастрычніцкай, быў праведзены шахматны матч. У састаў каманды ўваходзілі па 3 мужчыны і 2 жанчыны. Шматлікія гледачы і балельшчыкі з задавальненнем віталі гэтае цікавае мерапрыемства.

Перамогу атрымалі матэматыкі з лікам 4:1. Раней за ўсіх закончыў гульню Р. Ладышаў.

**Л. ГАРЭЛІК,**
галоўны суддзя спаборніцтваў,
суддзя першай катэгорыі.

## А. ГАНТВАРГ — ЧЭМПІЁН СССР

Выдатнага поспеху дасягнуў студэнт матэматычнага факультэта нашага універсітэта Анатоль Гантварг. Ён выйшаў пераможцам у розыгрышы першынства СССР па стоклетачных шашках і заваяваў залаты медаль чэмпіёна краіны.

Застаецца дадаць, што днямі Анатолю прысвоена званне гросмайстра.

## У НАПРУЖАНЫМ ПАЯДЫНКУ

Добрую падрыхтоўку, волю да перамогі выявілі ўдзельнікі першынства БДУ па вольнай барацьбе. У напружаным паядынку мераліся сіламі 129 барцоў. Чэмпіёнамі ў парадку вагавых катэгорый сталі О. Шынкароў (гістфак, I к.), А. Аблецоў (геафак, II к.), Б. Гудзьеў (юрфак, IV к.), Е. Купрын (фізфак, III к.), В. Юркевіч (фізфак, I к.), В. Дамашоў (матфак, II к.), Г. Шчалакоў (хімфак, IV к.), Г. Староцкі (фізфак, I к.), М. Міхайлаў (юрфак, IV к.), В. Фралоў (юрфак, IV к.).

У камандным заліку першае месца занялі юрысты (30 ачкоў), II — фізікі (39), III — гісторыкі (60), IV — журналісты (100), V — матэматыкі (101), VI — хімікі (107), VII — географы (120).

IV месца журналістаў можна лічыць як вялікі поспех. Раней іх каманда ні разу не паднімалася вышэй апошняга месца. А філфак і біяфак увогуле не выставілі каманд.

**А. САЧАНКА,**
студэнт.



**У СНЕЖНЫМ УБРАННІ.**

Фотаэцюд Г. Марозава.

## НА СТУДЭНЦКІМ КУРОРЦЕ

*Летам ля сцен плёскаюць марскія хвалі, пад вокнамі ціха журчыць невялікая рачулка. Зімою ўсё заносіць снегам, толькі разбягаюцца ў розныя бакі ад студэнцкай здраўніцы лыжныя сцяжынкі ды знікае за паваротам на Мінск след аўтамашыны.*

*На працягу месяца ў прафілакторыі папраўляюць здароўе і адпачываюць студэнты. Больш 80 юнакоў і дзяўчат жывуць цяпер на беразе Мінскага мора. Сярод іх Міша Шаўыркін — студэнт філалагічнага факультэта, Зоя Шэйна і Міша Бацян з журфака, студэнты фізічнага і іншых факультэтаў. Зараз яны не толькі адпачываюць, але і рыхтуюцца да зімовай сесіі.*

*За год існавання прафілакторыя больш 800 студэнтаў набраліся тут сіл і здароўя.*

*Я. БРАНЕЎСКІ.*

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 19095 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106 Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 2033. Тыраж 2000 экз.